АЛЕГ СТРЫЖЭНАЎ У ЖЫЦЦІ І НА ЭКРАНЕ

5

ЛЁС НА КАНІ НЕ АБ'ЕДЗЕШ

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

9 ЖНІЎНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 154 (30288)

КАРАТКА

• У сувязі з распрацоўкай буралому выстава «Лесдрэўтэх» пераносіцца на 2025 год.

• Заяўкі на конкурс народных выканальніцкіх мастацтваў «Душа народная» прымаюцца да 26 жніўня.

• Уладзімір Пуцін падпісаў закон аб ратыфікацыі пратакола з Беларуссю аб спагнанні аліментаў.

• Белгідрамет: у Слаўгарадзе, які пацярпеў ад аварыі на ЧАЭС, паляпшаецца радыяцыйная абстаноўка.

ЦЫТАТА ДНЯ

Вольга ЧУПРЫС, намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Справядлівасць крымінальнага закону — гэта не толькі жорсткія санкцыі. Гэта ў тым ліку розныя санкцыі, якія даюць магчымасць судам прымяняць пакаранне, зыходзячы з усіх умоў учыненага злачынства і асобы самога правапарушальніка. Падобныя злачынствы па ступені грамадскай небяспекі павінны мець аднолькавае санкцыйнае забеспячэнне. Умоўна кажучы, калі ўчынена махлярства ў саставе арганізаванай групы асоб і крадзеж у саставе арганізаванай групы асоб, то, адпаведна, санкцыйнае забеспячэнне павінна быць аднолькавым. Калі размова ідзе аб забруджванні вод і забруджванні атмасфернага паветра, то гэтыя злачынствы блізкія па сваёй сутнасці і, такім чынам, таксама павінна быць аднолькавым санкцыйнае забеспячэнне».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Нам трэба трымацца разам»

Падрабязнасці мужчынскай адкрытай размовы з міністрамі ўнутраных спраў краін СНД

У Мінску гэтымі днямі праходзіць пасяджэнне Савета міністраў унутраных спраў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. На парадку дня — пытанні барацьбы са злачыннасцю, умацаванне правапарадку і арганізацыі ўзаемадзеяння міністэрстваў унутраных спраў дзяржаў — удзельніц СНД. Гэтыя пытанні ўдзельнікі пасяджэння абмеркавалі і з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам ЛУКАШЭНКАМ.

Фота БелТА.

НА ПРЫНЦЫПАХ АДКРЫТАСЦІ, ДАВЕРУ І ЎЗАЕМАДАПАМОГІ

Прэзідэнт Беларусі адразу настроіў усіх не на пратакольную, а на шчырую размову на важныя тэмы. «Я часта сустракаюся з кіраўнікамі АДКБ, СНД, сілавых ведамстваў. І ў нас заўсёды сумленная, адкрытая, прынцыповая размова. У сувязі з гэтым, рыхтуючыся да нашай сустрэчы, я падумаў аб галоўным і хачу аб гэтым сказаць. Мы, мужыкі, можам адкрыта пра гэта казаць. У апошні час склалася такая сітуацыя, у тым ліку ў сувязі з правядзеннем спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне, што многія кіраўнікі (і што граху ўтойваць, і сілавікі, чаго быць катэгарычна не павінна) пачалі нейкую выгаду для сябе ў гэтым шукаць, — адзначыў ён. — Ведаеце, мужыкі, зыходзячы са свайго вопыту, скажу, што жыццё такое бурнае цяпер і вельмі зменлівае. Многія шукаюць для сябе выгаду, у тым ліку адыходзячы ад агульнага нашага, створанага ў савецкія часы трэнду развіцця». Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што часткова гэта звязана з тым, што краіны, асцерагаючыся санкцыйнага ціску, аддаляюцца ад Расіі і шукаюць больш выгадныя для сябе шляхі. «Не рабіце гэтага. Яшчэ раз падкрэсліваю, жыццё вельмі бурнае, зменлівае. І хто ведае, што будзе заўтра з намі, з нашымі дзяржавамі, ці не давядзецца звярнуцца да той жа Расіі па дапамогу. А апошнія падзеі гавораць аб тым, што нікому мы не патрэбныя — ні Расія, ні мы з вамі. Нам трэба трымацца разам», — падкрэсліў ён. Па словах беларускага лідара, палітычны курс Захаду можа актыўна мяняцца. «Вось быццам бы выбудавана палітыка Злучаных Штатаў Амерыкі ў свеце за апошнія чатыры гады пры цяперашнім прэзідэнце. Вызначана: гэтыя — сябры, гэтыя — ворагі, гэты сукін сын, але наш, гэты — чужы. Улада памяняецца — будзе як у Афганістане, сапраўды будзе, гэта не першы раз. Ім для таго, каб уладу памяняць, трэба абавязкова якую-небудзь вайнушку развязаць. Не дай бог, яны выкарыстаюць канфліктную сітуацыю на Блізкім Усходзе для развязвання новай сусветнай вайны. Яны і на гэта гатовы пайсці. Я, крый божа, не агітую вас супраць ЗША ці нейкіх вашых традыцыйных саюзнікаў. Вы з усімі павінны сябраваць і выбудоўваць адносіны з тымі, хто гэтага жадае. Але не губляйце тое, што мы стварылі за апошнія гады. Гэта шмат у чым залежыць ад нас, сілавікоў. Шмат у чым залежыць. Я пра гэта падумаў, ідучы на нашу сустрэчу», — падзяліўся сваімі думкамі Аляксандр Лукашэнка.

«Наша раўнапраўнае партнёрства, падмацаванае добрай дагаворнай базай, праверанае часам, сфарміравана на прынцыпах адкрытасці, даверу і ўзаемадапамогі», — заўважыў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Жніво-2024

ХЛЕБАМ І ПЕСНЯЙ

Гаспадаркі і раёны Брэстчыны спраўляюць дажынкі

Брэстчына ўпэўнена набліжаецца да фінальнай кропкі ў справе ўборкі ўраджаю збожжавых і зернебабовых. Многія гаспадаркі ўжо правялі дажынкі, справілі свята ўраджаю і некаторыя раёны.

СТАР. 3

Актуальна

Абітурыенты сталі студэнтамі

Уступная кампанія 2024 года прайшла ў поўнай адпаведнасці з правіламі прыёму

Дакументы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны падалі больш за 40,5 тысячы абітурыентаў. Залічана каля 30 тысяч, і гэта на 2,5 тысячы больш у параўнанні з мінулым годам. Вырасла колькасць залічаных без уступных іспытаў і па-за конкурсам. Гэта матываваныя, таленавітыя маладыя людзі, якія дасягнулі высокіх вынікаў падчас навучання ў школах і каледжах. Такіх сёлета было каля 4,3 тысячы, з іх 1,4 тысячы — уладальнікі залатых і сярэбраных медалёў або дыпломаў каледжаў з адзнакай. Сюды ж адносяцца больш як 850 выпускнікоў каледжаў па педагагічных спецыяльнасцях і больш чым 300 навучэнцаў профільных класаў прафесійнай накіраванасці і кадэцкіх вучылішчаў. Студэнтамі ВНУ сталі і 90 выпускнікоў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. Набор мэтавікоў павялічыўся больш як на тысячу.

СТАР. 4

«Нам трэба трымацца разам»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён падкрэсліў, што ніхто з міністраў не скажа, што, напрыклад, міністр унутраных спраў Расіі на кагосьці цісне. Наадварот — усе міністры дапамагаюць адзін аднаму і аказваюць максімальную падтрымку, наколькі гэта магчыма. «Гэта гаворыць на карысць нашага супрацоўніцтва. За гады сумеснай працы мы не раз пераконваліся: толькі разам можна максімальна эфектыўна супрацьстаяць глабальным, трансгранічным, а таксама ўнутраным пагрозам, таму што побач — сябры і паплечнікі, якія заўсёды падставяць плячо, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — З боку Беларусі вы атрымаеце толькі гэта. Мы заўсёды будзем, наколькі гэта магчыма і немагчыма, падтрымліваць і супрацоўнічаць з усімі вамі». Прэзідэнт заўважыў, што памылкова думаць аб тым, што невялікая дзяржава не можа быць карыснай іншай дзяржаве. Калі ёсць жаданне — нават невялікія дзяржавы могуць падставіць плячо і сур'ёзна дапамагчы партнёрам у розных праблемных сітуацыях.

«Міністэрствы ўнутраных спраў краін СНД — гэта, па сутнасці, шчыт для добрапрыстойных грамадзян і меч для злачыннага свету. Але толькі, калі мы будзем разам. Зыходзячы з гэтага, Беларусь заўсёды выступала і выступае паслядоўным прыхільнікам інтэграцыі ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў, у дадзеным выпадку — далейшай інтэграцыі праваахоўных органаў», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што задачы перад Міністэрствамі ўнутраных спраў стаяць сур'ёзныя. І акрэсліў асноўныя з іх.

ПЕРШАЯ — ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЗАКОННАСЦІ, МІРУ, ПАРАДКУ І СТАБІЛЬНАСЦІ НА ПОСТСАВЕЦКАЙ ПРАСТОРЫ

«Мы цудоўна бачым, як сёння нашы краіны спрабуюць пасварыць і раскалоць знутры. Мы знаходзімся пад прэсам незаконных, абсалютна незаконных аднабаковых эканамічных санкцый. Супраць нашых народаў вядзецца перманентная гібрыдная вайна», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Як адзначыў беларускі лідар, у кожнай краіне можа скласціся сітуацыя, якую без адзінства з саюзнікам не вырашыць. «І калі мы сёння гэтага не зразумеем, з намі разбяруцца паасобку. Але калі абрынецца Расія, мы ў гэтую варонку ўсе пацягнемся», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што за апошнія некалькі гадоў «каляровым рэвалюцыям» падвяргаліся ўсе краіны СНД. Хоць, паводле яго слоў, у Беларусі ў 2020 годзе была не «каляровая рэвалюцыя», а адкрыты мяцеж. «Каляровая рэвалюцыя» — больш спакойная, працяглая па часе — яна ніяк не магла прайсці ў Беларусі, таму абралі шлях мяцяжу, наскокам узяць уладу тут, як фашысты ў 1941-м», — растлумачыў ён. Падобныя сцэнарыі, няхай і ў больш мяккім варыянце, ужо разгортваліся ў Арменіі, Кыргызстане, Казахстане, Узбекістане. І, як звярнуў увагу беларускі лідар, «хворыя месцы» ў гэтых краінах у спакоі не пакінуць і ўвесь час будуць на іх іграць. «У 2020 годзе такую «каляровую рэвалюцыю» спрабавалі пракруціць і ў Беларусі. Разлічвалі на бліцкрыг. Дзейнічалі па вядомых метадычках. Мы тады не дапусцілі развалу краіны і пачатку грамадзянскай вайны і зрабілі шэраг радыкальных крокаў па змене сітуацыі ў Беларусі», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

ДРУГАЯ ЗАДАЧА — ПРОЦІДЗЕЯННЕ ТЭРАРЫЗМУ ЯК УНУТРАНАМУ, ТАК І ЗНЕШНЯМУ

Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, зараз на прасторы СНД у сувязі з дзейнасцю Захаду, і перш за ўсё ЗША ва Украіне, гэта праблема квітнее. Таму барацьбу з тэрарызмам ён назваў найважнейшай задачай. «Я заўсёды свайму міністру кажу: без міліцыі мы нічога не зробім. Ні КДБ, ні Міністэрства абароны, ні вертыкаль улады, якая ў нас жорсткая, — ніхто нічога не зробіць без міліцыі. Міліцыя ведае ўсё. Робіць яна — не робіць, гаворыць пра гэта — не гаворыць, але міліцыянеры ведаюць усё. Яны ўсюды — ад участковага да міністра ўнутраных спраў. Таму ад вас у любой краіне залежыць усё. А галоўнае — гэта атрымаць папераджальную інфармацыю. Калі яна ад вас паступае — значыць, мы пачынаем дзейнічаць».

Беларускі лідар звярнуў увагу, што сёння міжнародны тэрарызм выкарыстоўвае найноўшыя тэхналогіі і медыярэсурсы для прапаганды сваёй дзейнасці. Таму, па яго словах, эфектыўная барацьба з гэтым злом патрабуе комплекснага падыходу, які ўключае палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя меры, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва і абмен інфармацыяй. «Толькі разам можна супрацьстаяць гэтаму», — канстатаваў ён.

ТРЭЦЯЯ ЗАДАЧА — БАРАЦЬБА З КІБЕРЗЛАЧЫНСТВАМІ

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што зараз гэта агульная праблема для краін СНД. Але факты сведчаць аб тым, што сітуацыю паступова ўдаецца пераламаць. «Пасля пачатку правядзення СВА намі зафіксавана актывізацыя дзейнасці махляроў, у тым ліку і кол-цэнтраў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Украіны. Узрасла колькасць спроб дэстабілізацыі работы дзяржорганаў шляхам загадзя лжывых паведамленняў аб мініраванні важнейшых дзяржаўных аб'ектаў. А таксама махлярствы ў адносінах да звычайных грамадзян. На тэрыторыі вашых краін таксама ёсць такая праблема, таму досвед барацьбы з падобным злом будзе цікавы ўсім», — падсумаваў ён.

ЧАЦВЁРТАЯ ЗАДАЧА — ЗАХАВАННЕ ПАМЯЦІ

Асаблівая ўвага на сёлетнім пасяджэнні будзе ўдзелена святкаванню 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. «Дзень Перамогі — самая памятная і ўрачыстая дата ў нашай агульнай гісторыі. Яна сімвалізуе адзінства і мужнасць савецкіх народаў перад тварам фашызму — найстрашнейшай пагрозы ўсяму чалавецтву. Тут у нас разыходжанняў няма. Усе народы Савецкага Саюза ваявалі і тысячамі гінулі на франтах. Больш за тое, народы Цэнтральнай Азіі прытулілі мільёны жыхароў тых тэрыторый, якія былі акупаваныя ў першыя гады вайны», — заўважыў Прэзідэнт. Ён выказаў упэўненасць, што Заява Савета міністраў унутраных спраў, якая будзе прынята па выніках форуму, стане не толькі данінай памяці дзясяткам мільёнаў вайскоўцаў і мірным савецкім грамадзянам, якія загінулі дзеля таго, каб мы сёння жылі. Гэта будзе зварот да наступных пакаленняў з заклікам свята берагчы гістарычную памяць і праўду пра найстрашнейшую вайну. «І ніколі не забывацца, што мы — нашчадкі Пераможцаў. І гэта вялікі наш здабытак», — сказаў беларускі лідар.

БУДЗЕМ РАЗАМ — НІЯКІЯ «КАЛЯРОВЫЯ РЭВАЛЮЦЫІ» НАМ НЕ СТРАШНЫЯ

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што не трэба забывацца і аб слабадзённых пытаннях і не зацыкліваца толькі на захаванні памяці аб вайне. «Давайце будзем сур'ёзна дзейнічаць па асноўных кірунках міністэрстваў унутраных спраў. Яны выразна выкрышталізаваны жыццём, яны дакладна вызначаны. І вось там трэба прымаць рашэнні. Калі мы прынялі рашэнне — давайце ў гэтым кірунку будзем дзейнічаць усе разам. Не дай бог, каб у нашых краінах, незалежных дзяржавах адбылося нешта, калі трэба будзе звяртацца да поўнамаштабнага дзеяння сілавых структур. Але мы ад гэтага не застрахаваны. Будзем разам — і ніякія «каляровыя рэвалюцыі» і іншыя мяцяжы нам не страшныя», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў міністрам за гатоўнасць да супрацоўніцтва, за імкненне і надалей актывізаваць сумесныя намаганні для забеспячэння бяспекі і аховы правапарадку. «Вы павінны ведаць: мы заўсёды гатовы прыйсці да вас на дапамогу, гатовы дзейнічаць адэкватна. Толькі давайце па дробязях сварыцца не будзем. Гэта заўсёды накладвае не нармальны адбітак на нашу работу, — падкрэсліў ён. — Наша пазіцыя — мы толькі за тое, каб мы былі разам. Мы хочам быць разам з вамі. У адваротным выпадку нас паасобку парвуць, падзеляць і моцныя свету гэтага, вы ведаеце хто гэта, возьмуць нас цёпленькімі, не прыклаўшы на гэта ніякіх намаганняў. Таму давайце будзем разам».

Ад імя ўсіх членаў Савета міністр унутраных спраў Азербайджана Вілаят Эйвазаў падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за цёплы прыём. «Нашы краіны звязаныя цеснай сувяззю сяброўства. Узаемадзеянне паміж органамі ўнутраных спраў нашых краін знаходзіцца на высокім узроўні. Ёсць прававая аснова, паспяхова адшукваем злачынцаў, абменьваемся вопытам», — адзначыў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

ПРАБЛЕМА АДНА — ЗЛАЧЫННАСЦЬ, ЯНА НЕ МАЕ МЕЖ

Размаўляючы з журналістамі, міністр унутраных спраў Расіі Уладзімір Калакольцаў заўважыў, што пытанні, якія абмяркоўвае Савет міністраў унутраных спраў СНД — не новыя, але важныя. «Кожны раз мы карыстаемся гэтай пляцоўкай, каб зверыць гадзіннікі і яшчэ раз закрануць самыя вострыя пытанні. Напрыклад, барацьбу з кіберзлачыннасцю, узаемадзеянне ў пытаннях вышуку злачынцаў, якія схаваліся. А ў нас ёсць станоўчыя вынікі ўзаемадзеяння. За паўгода міністэрствы ўнутраных спраў краін СНД сумесна адшукалі 213 грамадзян, якія знаходзяцца ў вышуку, з іх 130 — гэта тыя, каго шукала Расійская Федэрацыя. Шмат гэта ці мала, сказаць цяжка. Бо за кожным такім злачынцам стаяць лёсы кагосьці, чые правы парушаны. Ёсць станоўчыя пытанні. Ёсць пытанні, якія маюць патрэбу ў далейшай дапрацоўцы. Ва ўмовах сённяшняй рэканструкцыі светаўладкавання запатрабаванасць міжнародных пляцовак узрастае. Такая пляцоўка, як Савет міністраў унутраных спраў краін СНД, яшчэ раз паказвае наша эфектыўнае ўзаемадзеянне. Мы маем паступальнае развіццё ў бок канкрэтнага выніку. А канкрэтны вынік — гэта вынікі праваахоўнай работы ўсіх калег на прасторах Садружнасці на карысць грамадзян нашых краін», — адзначыў ён.

Уладзімір Калакольцаў падкрэсліў, што міністэрствы ўнутраных спраў займаюць важнае месца ў дзяржаўным уладкаванні нашых краін: «Ад намаганняў і эфектыўнасці работы нашых ведамстваў залежыць дабрабыт людзей, іх адчуванне бяспекі. І па выніках нашай работы людзі даюць ацэнку дзейнасці ўсёй улады ў нашых дзяржавах. Таму мы стараемся выконваць задачы, якія ставіць перад намі народ, і даручэнні нашых кіраўнікоў. Мы запэўнілі Аляксандра Рыгоравіча, што пастараемся зрабіць усё магчымае, каб усе ўстаноўкі і даручэнні выконваліся дакладна ў тэрмін з высокім узроўнем выніковасці. І запэўнілі, што будзем дасягаць гэтага разам».

Міністр унутраных спраў Беларусі Іван Кубракоў адзначыў, што галоўная задача органаў унутраных спраў — працаваць так, каб кожны чалавек адчуваў сябе ў бяспецы. «І мы робім усё для таго, каб і ў нашай краіне, і ў краінах СНД людзі адчувалі сябе спакойна. Праблема ўсюды аднолькавая — гэта злачыннасць, а, як вядома, злачыннасць не мае меж. Мы з нашымі калегамі выпрацоўваем актуальныя рашэнні», — сказаў ён. Па словах міністра, ідзе актыўны абмен вопытам паміж праваахоўнікамі краін СНД. Напрыклад, краінам СНД цікавы досвед, які Беларусь набыла ў 2020 годзе. «Усе бачылі, якая была сітуацыя, які аказваўся ціск на супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і іх сем'і. І мы дзелімся гэтым досведам. Наш вопыт даволі цікавы, таму што тады мы выстаялі, не далі разграміць нашу краіну. Усе зацікаўлены, каб у краінах быў мір і парадак, таму ўсе калегі наш досвед пераймаюць», — адзначыў Іван Кубракоў. Ён падкрэсліў, што некаторыя яго калегі, якія першы раз прыехалі ў Беларусь, здзіўлены парадкам і бяспекай на вуліцах. «Яны асабіста пераканаліся, што людзі ў Беларусі адчуваюць сябе ў бяспецы. Для нас гэта самая галоўная ацэнка. Прэзідэнт сёння паставіў задачу міністэрствам унутраных спраў трымацца разам. Калі МУС працуе разам, адзіным кулаком, тады парадак будзе панаваць ва ўсіх краінах і нашы людзі ў любой краіне СНД будуць пачувацца ў бяспецы. І мы гэтую задачу выканаем», — падсумаваў міністр.

УЗМАЦНЯЕЦЦА ГУМАНІСТЫЧНЫ СКЛАДНІК

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўнёс у парламент законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці», рэалізаваўшы сваё канстытуцыйнае паўнамоцтва суб'екта права заканадаўчай ініцыятывы. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Распрацоўкай законапраекта займалася спецыяльна створаная пры Адміністрацыі Прэзідэнта рабочая група. З улікам установак кіраўніка дзяржавы, дадзеных 11 студзеня на нарадзе па асобных пытаннях удасканалення заканадаўства аб крымінальнай адказнасці, рабочая група правяла сістэмны аналіз нормаў крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага законаў. Па яго выніках выпрацаваны і рэалізаваны ў рамках законапраекта наступныя падыходы.

Перагледжаны санкцыі 97 складаў злачынстваў. З іх 65 складаў дапоўнены альтэрнатыўнымі больш мяккімі відамі пакаранняў (24 склады сёння ўтрымліваюць пазбаўленне волі як адзіна магчымае пакаранне). Яшчэ ў 32 склады ўнесены карэкціроўкі, у тым ліку для ліквідацыі дысбалансу ў санкцыях.

Узмацняецца гуманістычны складнік крымінальнага закона. Устанаўліваецца, што за няцяжкія злачынствы, учыненыя ўпершыню, жанчынам і адзінокім мужчынам, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў, а таксама непаўналетнім і інвалідам I групы пазбаўленне волі не прызначаецца. Выключэнне будуць складаць выпадкі, калі асоба здзейсніла злачынства экстрэмісцкай накіраванасці або звязанае з ужываннем гвалту. Аналагічныя правілы прадугледжаны ў частцы заключэння пад варту.

Пераводзяцца ў справы прыватна-публічнага абвінавачвання (узбуджаюцца па заяве пацярпелага) злачынствы аб парушэнні правілаў дарожнага руху, што пацягнула прычыненне шкоды блізкім сваякам або членам сям'і вінаватай асобы (ч. 2 арт. 317 КК). Дадзеная мера закліканая спрыяць унутрысямейнаму ўрэгуляванню канфлікту.

Законапраектам скарэкціраваны нормы пра адказнасць за нарказлачынствы. Прадугледжваюцца альтэрнатыўныя больш мяккія пакаранні ў выглядзе арышту на тэрмін да трох месяцаў за набыццё або захоўванне наркотыкаў (ч. 1 арт. 328 КК); абмежаванне свабоды за разавыя выпадкі іх збыту (ч. 2 арт. 328 КК). Адначасова скарачаецца ніжні памер пакарання за збыт наркотыкаў у складзе арганізаванай групы з 10 да 8 гадоў пазбаўлення волі (ч. 4 арт. 328 КК).

Адпаведныя меры дазволяць судам больш гнутка падыходзіць да пытанняў прызначэння пакарання з улікам грамадскай небяспекі злачынства і асобы вінаватага.

Далейшая работа над законапраектам будзе ажыццяўляцца на пляцоўцы парламента.

Нарада

ВЯЛІКІ ГОРАД ПАТРАБУЕ ВЯЛІКАЙ УВАГІ

Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў Мінску Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з кіраўніцтвам сталіцы

На нарадзе з удзелам старшыні Мінгарвыканкама Уладзіміра Кухарава, яго намеснікаў і кіраўнікоў раённых адміністрацый разглядаліся пытанні дзейнасці прадпрыемстваў горада, яго добраўпарадкаванне і эфектыўнасць ўзаемадзеяння ўлады з насельніцтвам. На мерапрыемстве таксама прысутнічаў памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па г. Мінску Юрый Фралоў.

Фота БелТА.

Перш-наперш Наталля Качанава засяродзіла ўвагу ўдзельнікаў на эканамічным складніку жыцця Мінска. Яна адзначыла, што ад дзейнасці гарадскіх прадпрыемстваў залежыць не толькі развіццё горада ў цэлым, але і дабрабыт яго жыхароў. Так, прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця выконваюцца, але ж у аснове ўсіх ацэнак павінна быць эфектыўнасць работы кожнага асобна ўзятага прадпрыемства. На жаль, сёння яшчэ ёсць стратныя прадпрыемствы і такія, дзе своечасова не выплачваецца заработная плата. Хай яны і прыватнай формы ўласнасці, але ўсё роўна такога быць не павінна. Вядома, сітуацыя на кожным з іх розная: некаторыя ў санацыі, некаторыя ў банкруцтве... Аднак там працуюць людзі, жыхары горада, і яны не могуць заставацца без заробкаў.

«Альбо іх (гэтых людзей. — **Рэд.**) павінны разлічыць і працаўладкаваць на іншыя прадпрыемствы горада, альбо трэба давесці гэта да лагічнага завяршэння. Таму што працаваць са стратамі і не выплачваць заработную плату — гэта недазваляльна», — акцэнтавала ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі. Акрамя таго, яна нацэліла кіраўнікоў адміністрацый на тое, што яны абавязаны асабіста бываць на прадпрыемствах. На свае вочы ацаніць не толькі вытворчасць, але і ўмовы працы людзей: ці забяспечаны яны гарачым харчаваннем, ці ёсць пакоі для адпачынку, у якім стане бытавыя памяшканні. Нельга абмінаць увагай і прылеглую тэрыторыю, выгляд будынкаў...

Другое пытанне нарады — добраўпарадкаванне. Хоць летні перыяд яшчэ працягваецца, але восень ужо не за гарамі, і трэба рыхтавацца да ўласцівых ёй работ: недзе падсадзіць дрэвы, а недзе — і пасадзіць нанова. Акрамя таго яшчэ ёсць час для заканчэння работ па капітальным і бягучым рамонтах, незавершаных будоўлях.

Асобна Наталля Качанава спынілася на функцыянаванні зон адпачынку: іх у Мінску вельмі многа і работы па стварэнні новых працягваюцца — неўзабаве ў горадзе ўсяго такіх зон стане 80. Гэта вельмі добры прыклад для іншых рэгіёнаў краіны. «Але нам трэба ўсё дашліфаваць, каб у нас нідзе не было нейкіх «мёртвых» зон», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

І працягнула: «Парадак павінен быць усюды... Прадпрыемствы, арганізацыі, установы наводзяць парадак. Але жылыя дамы, дваровыя тэрыторыі... Часам едзеш: бачыш цоколь, які зелянінай пакрыўся, трава расце ўздоўж фасадаў. Так не павінна быць. Гэта не для сталіцы. Усё павінна быць на сістэмнай аснове. Не можа быць у Мінску паіншаму».

Акрамя таго, Наталля Качанава звярнула ўвагу ўдзельнікаў пасяджэння на ўзаемадзеянне гарадскіх улад з насельніцтвам, азначыўшы асабістыя прыёмы грамадзян яго найбольш эфектыўнай формай. І, адпаведна, рэагаванне на такія звароты павінна быць аператыўным, эфектыўным і дасканалым.

Таксама на нарадзе абмяркоўваліся пытанні развіцця сацыяльнай сферы, медыцынскага абслугоўвання і шэраг іншых.

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.

ХЛЕБАМ І ПЕСНЯЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адно з найлепшых сельгаспрадпрыемстваў Камянецкага раёна ААТ «Відамлянскае» ўшаноўвала перадавікоў жніва 1 жніўня. У полі знарок пакінулі маленькую дзялянку каласавой культуры, каб ва ўрачыстай абстаноўцы зжаць і звязаць дажыначны сноп. З работай цудоўна справілася жанчына ў нацыянальным касцюме, і гэтае дзеянне сімвалізавала само свята. Як і ўпрыгожаны кветкамі жытні вянок, што ўдзельніцы мастацкай самадзейнасці надзелі на шыю кіраўніка гаспадаркі, мэтра сельгасвытворчасці — Мікалая Страпко. А яшчэ ў гэты дзень у Відамлі было шмат духмяных каравяяў, падарункаў віноўнікам урачыстасці, а таксама музыкі і песень.

Добрыя словы герояў жніва адрасаваў **старшыня Камянецкага райвыканкама Віталь КУЛАК**. А днём раней кіраўнік раёна ўшаноўваў земляробаў ААТ «Александрыя-Агра». У гаспадарцы сёлета намалочана 5750 тон збожжа. У суседнім сельгаспрадпрыемстве «Макарава-Агра» намалот склаў таксама больш за паўтысячы тон пры ўраджайнасці 52 цэнтнеры з гектара. З дастойным вынікам аграрыяў павіншавалі кіраўнікі раённай і мясцовай улады. Справілі свята ўраджаю ў сельгаспрадпрыемстве «Агра-Ніва» і іншых гаспадарках раёна.

Першыя ж у вобласці і нават у краіне раённыя дажынкі адсвяткавалі хлебаробы Століншчыны. Варта сказаць, што раён завяршыў уборачную кампанію ў сціслыя тэрміны. Збожжавы клін сёлета заняў у раёне 21 400 гектараў. Уборка праходзіла ва ўмовах, калі трэба было разам са збожжавымі адначасова ўбіраць рапс і нарыхтоўваць кармы для грамадскага пагалоўя. Тэхніка працавала з ранку да позняга вечара, не падвялі і людзі. Такім чынам, аграрыі раёна яшчэ раз прадэманстравалі сваю адданасць справе і роднай зямлі.

Старшыня райвыканкама Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ шчыра дзякаваў усім ўдзельнікам уборачнай кампаніі:

— Мы вырасцілі і сабралі 92 тысячы тон збожжавых, што на 4 тысячы тон больш за паказчык мінулага года, — сказаў кіраўнік раёна. — Сярэдняя ўраджайнасць склала 42,9 цэнтнера з гектара. На вынік спрацавала мноства фактараў: пачынаючы з паспяхова праведзенай пасяўной, комплексу абаронных мерапрыемстваў і заканчваючы своечасовай падрыхтоўкай тэхнікі да ўборкі, дакладна арганізаванай уборачнай кампаніі.

Заслужаныя ўзнагароды атрымалі многія. Былі адзначаны асобныя гаспадаркі, экіпажы камбайнераў, механізатары, вадзіцелі, кіраўнікі і спецыялісты гаспадарак. Цэлы шэраг адзнак атрымалі ў гэты дзень працаўнікі СВК «Фядорскі». На сцэну па заслужаныя ўзнагароды выходзілі, акрамя кіраўніка гаспадаркі Мікалая Агафонава, камбайнеры Леанід Свірскі, Сяргей Дворак, Віктар Саўчук, Віталь Пешка, Аляксандр Пачуйка, вадзіцель Аляксей Курган, галоўны інжынер Дзяніс Савецкі. І нават у традыцыйным конкурсе на лепшую кампазіцыю з цюкоў саломы інсталяцыя «У гасцях у казкі» прафсаюзнай арганізацыі СВК «Фядорскі» заняла прызавое трэцяе месца.

— У гэтым годзе наша сельгаспрадпрыемства адзначае ганаровую дату — 75-годдзе з дня стварэння, — сказаў карэспандэнту «Звязды» **старшыня СВК «Фядорскі» Мікалай АГАФОНАЎ**. — Спецыялізуецца сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў на жывёлагадоўлі. Асноўай вытворчасці з'яўляецца комплекс па вырошчванні і адкорме маладняку і чатыры малочнатаварныя фермы. А раслінаводства забяспечвае кармавую базу жывёлагадоўлі. Варта сказаць, што адметнасць нашай гаспадаркі, яе эфектыўнасць на працягу 37 гадоў ствараліся калектывам пад кіраўніцтвам Рыгора Аляксеевіча Дзямко. Дарэчы, наш былы старшыня, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі быў ганаровым госцем раённых дажынак. І нам не было сорамна перад Рыгорам Аляксеевічам за вынікі працы на ўборцы. Усе службы спрацавалі зладжана, не падвялі механізатары, вадзіцелі.

Андрэй ЗАСІМОВІЧ, дырэктар ААТ «Новая Прыпяць», гаспадаркі, якую таксама ўшаноўвалі на раённым святе ўраджаю, сказаў, што галоўны набытак сельгаспрадпрыемства — гэта яго калектыў:

— У гаспадарцы ёсць механізатары, проста акадэмікі сваёй справы, бо для атрымання высокага ўраджаю галоўнае — правільна ўзараць глебу, якасна пасеяць, а тады ўжо спрацуюць усе астатнія фактары. Радуе, што на змену вопытным майстрам хлебнай нівы прыходзяць маладыя.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Большасць немцаў выступаюць за датэрміновыя выбары ў Германіі

Больш чым палова грамадзян Германіі выступаюць за тое, каб у краіне былі праведзены датэрміновыя выбары. Гэта вынікае з апытання інстытута вывучэння грамадскай думкі INSA, праведзенага для газеты Bild, паведаміла РІА «Новости». Згодна з вынікамі апытання, 53 працэнты рэспандэнтаў выступаюць за датэрміновыя выбары ў Германіі, у той час як 37 працэнтаў гатовы дачакацца заканчэння кадэнцыі бягучага ўрада да восені 2025 года, 10 працэнтаў не змаглі вызначыцца з меркаваннем. Адзначаецца, што большасць прыхільнікаў кіруючых партый «Зялёныя» (74 працэнт) і сацыял-дэмакратаў (СДПГ, 78 працэнтаў) выступаюць за захаванне кааліцыі да наступных парламенцкіх выбараў, у той час як 43 працэнты выбаршчыкаў, якія ўваходзяць у кааліцыю свабодных дэмакратаў (СвДП), выказаліся за датэрміновыя выбары. З праведзенага раней апытання INSA вынікае, што папулярнасць кіруючай у Германіі кааліцыі ўпала да рэкордных 30 працэнтаў — найніжэйшы вынік з 2021 года, калі СДПГ, СвДП і «Зялёныя» прыйшлі да ўлады.

Даўгі амерыканцаў узраслі да 17,8 трыльёна долараў

Сукупная запазычанасць хатніх гаспадарак ЗША ў другім квартале павялічылася на 109 мільярдаў долараў адносна папярэдніх трох месяцаў і дасягнула рэкордных $17,8 трлн. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні Федэральнага рэзервовага банка (ФРБ) Нью-Ёрка. У параўнанні з канцом 2019 года сума даўгоў выросла на $3,7 трлн. Запазычанасць амерыканцаў па іпатэчных крэдытах павысілася на $77 млрд у паквартальным параўнанні і дасягнула $12,5 трлн. Запазычанасць па аўтамабільных крэдытах выросла да $1,63 трлн. Пазыкі па крэдытных картах павялічыліся да $1,14 трлн. Тым часам запазычанасць па студэнцкіх крэдытах склала $1,59 трлн.

У Вене з-за пагрозы тэракта адменены канцэрты Тэйлар Свіфт



Арганізатары трох канцэртаў амерыканскай спявачкі Тэйлар Свіфт у Вене (на кожным чакалася да 65 тысяч гледачоў) адмянілі іх пасля таго, як улады аб'явілі аб арыштах падазроных, якія планавалі ўчыніць тэракты на адным з гэтых мерапрыемстваў, паведаміў Euronews. Як заявілі аўстрыйскія ўлады, 19-гадовы галоўны падазраваны быў арыштаваны ў Цярніцы, на поўдзень ад Вены, а другі — у аўстрыйскай сталіцы. Франц Руф, дырэктар па грамадскай бяспецы міністэрства ўнутраных спраў Аўстрыі, паведаміў, што адзін са зламыснікаў прысягнуў на вернасць групоўцы «Ісламская дзяржава». Мяркуецца, што 19-гадовы грамадзянін Аўстрыі радыкалізаваўся ў інтэрнэце. Паведамляецца, што ў яго былі канфіскаваны хімічныя рэчывы, якія знаходзяцца на экспертызе. Канцлер Аўстрыі Карл Нехамер у публікацыі ў сацсетцы адзначыў, што сітуацыя вакол пагрозы тэракта ў Вене «была вельмі сур'ёзнай». Паводле яго слоў, пагрозы ўдалося выявіць дзякуючы супрацоўніцтву з замежнымі службамі.

Абітурыенты сталі студэнтамі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Для абітурыентаў і іх бацькоў былі створаны камфортныя ўмовы, — канстатаваў **першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр БАХАНОВІЧ.** — Вынікі ўступнай кампаніі дазваляюць зрабіць выснову аб правільнасці прынятых рашэнняў па ўдасканаленні арганізацыі прыёму ў ВНУ. Змяненняў у правілы ў наступным годзе не плануецца — дзейная рэдакцыя дае магчымасць у поўнай меры забяспечыць усе неабходныя ўмовы для паступлення.

Адной з ключавых навацый сёлетняй уступнай кампаніі стала правядзенне цэнтралізаваных экзаменаў і тэсціравання ў адзіныя тэрміны.

— Сёлета разам з інфармацыяй аб выніках ЦЭ і ЦТ абітурыентам была дадзена магчымасць азнаёміцца са сканкопіямі работ у асабістых кабінетах. Да пачатку экзамену была даступная інфармацыя аб парадку разліку першасных балаў за кожнае заданне і табліцы адпаведнасці першасных і тэставых балаў ідэнтычныя табліцам мінулага года, — кажа Аляксандр Генадзевіч. — У сукупнасці гэта дазволіла зрабіць працэдуру праверкі і ацэньвання экзаменацыйных работ празрыстай, стварыць роўныя ўмовы для выпускнікоў 2024-га і мінулых гадоў.

Уражвае і статыстыка атрымання максімальна магчымага выніку тэсціравання. Яго ў гэтым годзе дабіліся 695 абітурыентаў, і гэта практычна на 100 чалавек больш, чым у 2023 годзе.

Першы намеснік міністра нагадаў, што актыўная фаза ўступнай кампаніі пачалася яшчэ ў лютым, калі ў 21 рэгіянальнай ВНУ завяршыліся ўніверсітэцкія алімпіяды па навучальных прадметах. Каля тысячы пераможцаў былі рэкамендаваны да залічэння без уступных экзаменаў. У выніку залічаны на запатрабаваныя спецыяльнасці 375 лідараў алімпіяд, 22 пераможцы ўзялі ўдзел у конкурсе на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі.

МЭТАВІКІ

На гэтую траекторыю паступлення ўскладаліся вялікія надзеі. І яны апраўдаліся. Як адзначыў прадстаўнік ведамства, у бягучым годзе былі асабліва актыўныя заказчыкі кадраў, якія падавалі заяўкі на мэтавую падрыхтоўку. Аднак на пустым месцы такая актыўнасць не ўзнікла. Прафарыентацыйная работа была арганізавана ў новым фармаце, а прыцягненне да яе арганізацый — заказчыкаў кадраў стала самым шырокім. З пачатку года было праведзена больш за дзве тысячы спецыялізаваных мерапрыемстваў, у тым ліку дні адкрытых дзвярэй, кірмашы вакансій, кірмашы мэтавай падрыхтоўкі і іншыя. Больш за ўсіх прыцягнула XXI Міжнародная спецыялізаваная выстава «Адукацыя і кар'ера», прызначаная для школьнікаў, абітурыентаў, студэнтаў, выпускнікоў ВНУ і бацькоў. У ёй узялі ўдзел звыш 120 арганізатараў і больш чым 12 тысяч наведвальнікаў. Сістэма прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі была прадстаўлена 44 каледжамі.

З прыцягненнем звыш 900 арганізацый — заказчыкаў кадраў было арганізавана і другое маштабнае мерапрыемства — «Адзіны дзень адкрытых дзвярэй». Каля 25 тысяч абітурыентаў і іх бацькоў наведалі ВНУ і каледжы краіны. І вось якім атрымаўся вынік.

— План прыёму мэтавікоў склаў 5,6 тысячы месцаў (на 1 тысячу больш, чым у мінулым годзе). Колькасць жа абітурыентаў, якія падалі дакументы, перавысіла 6 тысяч. Такім чынам па дагаворах залічана на 1,1 тысячы студэнтаў больш, чым у 2023 годзе, — прывёў лічбы першы намеснік міністра.

СЁННЯ ГЭТА ПРЭСТЫЖНА

Падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыяй у міністэрстве лічаць на сёння адной з найважнейшых, бо менавіта ў такіх кадрах маюць вострую патрэбу галіны эканомікі Беларусі. У ведамстве канстатуюць, што сёння ўсё больш маладых людзей атрыманне такой адукацыі лічаць прэстыжным, а аб попыце на яе гавораць і лічбы. Канчатковыя вынікі падводзіць пакуль яшчэ рана — прыёмная кампанія ў каледжах краіны ідзе поўным ходам, але папярэднія даныя набору ўжо ёсць. Так, на пачатак жніўня на ўзровень ПТА заявы падалі 20,2 тысячы абітурыентаў. На ўзровень ССА на аснове агульнай базавай адукацыі прынята 26,6 тысячы дакументаў, а на аснове агульнай сярэдняй адукацыі — 9,3 тысячы. Да 13 жніўня працягнецца прыём на платнае навучанне на аснове агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі.

У той жа час першы намеснік міністра адзначыў, што конкурс, у адрозненне ад прахаднога бала, не лічыцца тым паказчыкам, які сведчыць аб запатрабаванасці спецыяльнасцяў.

— Таму што на тры бюджэтныя месцы можа паступіць 30 заявак, конкурс тады складзе 10 чалавек на месца. Каб атрымаць такі ж конкурс на спецыяльнасці, на якія мы набіраем 100 бюджэтнікаў, патрэбна адна тысяча заявак, — тлумачыць ён.

У Міністэрстве адукацыі настойліва рэкамендуюць абітурыентам 2025 года ўважліва азнаёміцца з гэтымі лічбамі (яны захоўваюцца на сайтах універсітэтаў на працягу года). Для тых, хто захоча паўтарыць спробу ў наступным годзе, — гэта цудоўная магчымасць сур'ёзна падцягнуць свае слабыя месцы і прааналізаваць памылкі. Тыя, хто будзе паступаць упершыню, змогуць ацаніць свае магчымасці, падумаць і, магчыма, абраць іншы кірунак. Часу для гэтага будзе дастаткова.

Факт абнадзейлівы, бо роўна столькі спецыялістаў у свой час гарантавана атрымаюць прадпрыемствы і арганізацыі краіны і столькі ж выпускнікоў ВНУ гарантавана атрымаюць сваё першае працоўнае месца.

Яшчэ дзве добрыя навіны: на сёння — найбольшая колькасць мэтавікоў залічана на такія запатрабаваныя спецыяльнасці, як медыцынская, педагагічная і сельскагаспадарчая, і на перспектыву — па словах **намесніка старшыні Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Вольгі СМІРНОВАЙ**, у 2024/2025 навучальным годзе ў Мінску значна павялічыцца колькасць старшакласнікаў, якія выбралі педагагічны кірунак для навучання ў профільных класах.

— Фармат прыёму абітурыентаў-мэтавікоў сёлета не змяніўся, — працягнуў Аляксандр Бахановіч. — Уступная кампанія для іх была вынесена за рамкі асноўнага прыёму і праведзена з 27 чэрвеня да 12 ліпеня. Разам з тым асаблівасцю прыёму мэтавікоў гэтага года з'яўляецца павышэнне патрабаванняў да заказчыкаў кадраў (неабходнасць забеспячэння конкурсу кожным заказчыкам па большасці спецыяльнасцяў) і да паспяховасці абітурыентаў — быў уведзены ніжні парог сярэдняга бала дакумента аб адукацыі не ніжэйшы за 7,0.

ПАПЯРЭДЖАНЫ — ЗНАЧЫЦЬ УЗБРОЕНЫ

— Па шэрагу спецыяльнасцяў у прыёмную кампанію гэтага года павысіліся прахадныя балы. У топ-5 увайшлі «Сусветная эканоміка» (БДУ) з прахадным балам у 395 балаў, «Стаматалогія» (БДМУ) — 395, «Праграмная інжынерыя» (БДУІР) — 395, «Эканамічная інфарматыка» (БДУ) — 394, «Прыкладная інфарматыка» (БДУ) — 391. Прыемна, што назіраецца рост прахадных балаў на спецыяльнасці фізіка-матэматычнага і інжынернага профіляў. У топ-5 спецыяльнасцяў па конкурсе ўвайшоў «Графічны дызайн і мультымедыядызайн»: у ГрДУ імя Я. Купалы на гэтую спецыяльнасць конкурс склаў 20,5 чалавека на месца, у БДУ — 19. На спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» (БДУІР) конкурс быў 6,9 чалавека на месца, «Трэнерская дзейнасць» (БДУФК) — 5,5 чалавека, «Правазнаўства» (ВДУ імя П. М. Машэрава) — 3,4 чалавека на месца, «Дзяржаўнае кіраванне і права» (АКП) — 3,3 чалавека на месца, — агучыў лічбы Аляксандр Бахановіч.

КРОК У ПРАФЕСІЮ

І яшчэ адна падказка, аб якой расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Дапамагчы вызначыцца з выбарам прафесіі будучым абітурыентам зможа і лічбавы сэрвіс дзяржаўнай службы занятасці «Крок у прафесію», распрацаваны міністэрствам. На базе гэтага праекта рэалізавана інтэрактыўная анлайн-дыягностыка, якая ўключае 30 камплектаў тэстаў. І хоць новы маштабны лічбавы рэсурс па прафесійнай арыентацыі прызначаны для ўсіх грамадзян, незалежна ад узросту — для маладых людзей, якія толькі пачынаюць пошук справы свайго жыцця, ён асабліва актуальны: прайшоўшы тэсціраванне, у суіскальніка з'яўляецца магчымасць вызначыцца са сферай інтарэсаў і выбраць прафесію з улікам сваіх уменняў і пераваг. Вынікі тэсціравання дадуць магчымасць убачыць не толькі кар'ерную траекторыю па канкрэтнай спецыяльнасці, але і атрымаць інфармацыю, у якой установе адукацыі можна набыць гэтую спецыяльнасць.

Алена ВІНАГРАДАВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Новыя кнігі

Збіраешся выступаць? Рыхтуйся!..

У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыла свет кніга доктара педагагічных навук, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандра РАДЗЬКОВА «Вкрапления в официальные, научные и корпоративные доклады, а также содержания бесед и разговоров».

Аляксандр Міхайлавіч вядомы чытачу па кнігах «Мой фізмат», «Рэктары», «Дыскрэтны падыход да назірання жыцця», «Пра матэматыку і матэматыкаў», якія пабачылі свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» і Выдавецкім доме «Звязда». «Пра матэматыку і матэматыкаў» — зборнік навукова-публіцыстычных нарысаў, які вытрымаў два выданні.

З выдавецкай анатацыі да кнігі «Вкрапления в официальные, научные и корпоративные доклады, а также содержания бесед и разговоров»: «Да любога выступлення перад людзьмі трэба рыхтавацца. Ці то гэта афіцыйная справаздача на пасяджэнні ўрада, ці даклад на навуковай канферэнцыі, ці чарговая лекцыя перад студэнцкай аўдыторыяй, ці размова перад калегамі па працы, ці віншаванне сябра з днём нараджэння, ці слова на дарогу маладажонам, ці тост на сяброўскім застоллі. Аўтар кнігі сабраў пад адной вокладкай «украпіны» — гісторыі, прытчы і анекдоты, якія дапамогуць утрымаць аўдыторыі, зробяць выступленне захапляльным і запамінальным».

Чытанне «Вкраплений...» — не на адзін дзень. Такую кнігу варта мець заўсёды, што называецца, пад рукою, на рабочым стале.

Уважлівы чытач за словамі публіцыста, дасведчанага ў многіх аспектах кіравання вучонага і чалавека сацыяльна актыўнага, знойдзе даволі шмат цікавых высноў. Абапіраючыся на вопыт папярэднікаў, славутых і добра вядомых асоб, часам на вопыт людзей, якія сустракаліся Аляксандру Міхайлавічу па жыцці, крочылі з ім нага ў нагу і якія зараз побач з ім, публіцыст робіць шмат цікавых высноў.

Цікавай падаецца і сама гісторыя нараджэння кнігі, пра што аўтар расказвае напрыканцы: «...Вырашыў паказаць пачатковыя старонкі кнігі сваім блізкім, а яны адразу заявілі:

— Выдаваць вялікім накладам ні ў якім разе нельга. Гэтым будзем карыстацца толькі мы!

Шмат што з прыведзеных у гэтай кнізе гісторый, афарызмаў, анекдотаў узятыя мною ў свой час з розных кніг, часопісаў, газет. Але некаторыя — з фальклору, ёсць і мае асабістыя. Гэта як у анекдоце. Суддзя пытаецца ў падсуднай:

— Колькі ў вас дзяцей?

— Пяць. Адно ад першага мужа, два ад другога і двое асабіста маіх!

На мой погляд, важна тое, што ўсе гэтыя гісторыі я выкарыстоўваў у выступленнях, многія не аднойчы. У іх адлюстроўваюцца мае погляды на сямейныя і грамадскія каштоўнасці, на культуру, што нас акружае, увогуле на жыццё. Украпіны ў мае выступленні заўсёды давалі эфект у выглядзе цікаўнасці слухачоў да ўсяго, пра што я гаварыў. Можа быць, яны і вам у жыцці спатрэбяцца. Карыстайцеся. Я іх, нарэшце, сабраў пад адной вокладкай».

Кнігу Аляксандра Радзькова «Вкрапления в официальные, научные и корпоративные доклады, а также содержания бесед и разговоров» можна набыць у кнігарнях ААТ «Белкніга» па ўсёй краіне, а таксама ў кнігарні «Акадэмкніга» ў Мінску па адрасе: праспект Незалежнасці, 72.

Сяргей ШЫЧКО.

З нагоды

Новыя ўзнагароды супрацоўнікаў Белтэлерадыёкампаніі

У пачатку тыдня, 5 жніўня, споўнілася 30 гадоў з дня ўтварэння Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. Юбілейная дата стала добрай нагодай адзначыць дасягненні супрацоўнікаў медыяхолдынга. Ганаровыя граматы і падзякі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь тэлевізіёншчыкам уручыў намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Пярцоў.

Узнагароджанне прайшло ў сценах Белтэлерадыёкампаніі. Ва ўрачыстай атмасферы Уладзімір Пярцоў перадаў Івану Эйсманту віншавальныя адрасы з нагоды 30-годдзя медыяхолдынга ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыя Крутога. Сваё віншаванне таксама накіраваў і Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Сергяенка.

«Усцешна, што імя нашай краіны ўпрыгожвае назвы тэлеканалаў грамадска-палітычнага, сямейнага, культурнага, спартыўнага і міжнароднага вяшчання. Усе разам і кожны паасобку яны выхоўваюць і натхняюць свайго гледача на добрыя і карысныя пачынанні», — гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта.

У сваім выступленні Уладзімір Пярцоў таксама цёпла павіншаваў калектыў Белтэлерадыёкампаніі з 30-годдзем і пажадаў новых творчых перамог:

«У нас ёсць любоў да нашай Радзімы і праўда, якую мы ўмела даносім да нашай аўдыторыі і, як паказалі нядаўнія замеры, да аўдыторыі і замежных дзяржаў, якія таксама вельмі сумуюць па праўдзе».

Грамат і падзяк Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь удастоіліся Вольга Шлягер, Ала Вярэніч, Іна Станіслаўчык і Кацярына Круталевіч. Жадаем калегам плённай працы і скарэння новых прафесійных вяршынь.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 204

Сваю новую задачу даслаў наш чытач Міхаіл Кошаль з Мінска ***(гл. дыяграму)***.

Белыя: Крd6, Фb4, Лf5, Сg6, пп. b2, f2 (6).

Чорныя: Крd3, пе3 (2).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Традыцыйны міжнародны турнір у Мінску сёлета прысвячаўся 100-годдзю з дня нараджэння славутага гросмайстра Давіда Бранштэйна. Спаборніцтва сабрала 204 удзельнікі, сярод якіх — 10 гросмайстраў, 6 міжнародных майстроў і 10 майстроў FIDE. Беларусь прадстаўлялі 133 гульцы, Расію — 38, яшчэ 29 шахматыстаў гулялі «пад сцягам» FIDE. Па адным удзельніку было заяўлена ад Францыі і Швейцарыі, два — ад Польшчы.

Прызавую тройку ў выніку склалі, набраўшы па восем балаў з 10 магчымых, расійскія шахматысты: гросмайстар Павел Панкратаў, міжнародны майстар Максім Самусенка і гросмайстар Уладзімір Бурмакін. Столькі ж балаў на рахунку майстра FIDE Аляксандры Тарасенка (Беларусь), але па дадатковых паказчыках яна чацвёртая.

Па 7,5 бала набралі пяць беларускіх шахматыстаў: майстар FIDE Міхаіл Спіжарны, міжнародныя майстры Максім Царук і Арцём Стрыбук, гросмайстар Андрэй Гаравец, Мікіта Раманоўскі.

Сярод тых, хто падзяліў 10—23 месцы (па 7 балаў), — беларускія гульцы Міхей Навуменка, Радзівон Сідарэня, Аляксей Аляксандраў, Веранікa Абрамкіна, Арцём Сіняўскі, Дамір Булгак, Валерый Смірноў, Серафім Крукоўскі, Міхаіл Царкоў і Маргарыта Бендзік, а таксама чатыры расійскія гросмайстры.

Павел Панкратаў — Андрэй Гаравец. 1. e4 c6 2. d4 d5 3. e5 Cf5 4. Kd2 e6 5. Kb3 Фc7 6. h4 h5 7. Ce2 Kd7 8. c3 0-0-0 9. Cf4 f6 10. Kf3 Kh6 11. Фd2 Фb6 12. 0-0 Kg4 13. Фc1 fe 14. de Kc5 15. Kbd4 Kd3 16. C:d3 C:d3 17. Лd1 Cg6 18. Kg5 Ле8 19. b4 c5 20. bc C:c5 21. Лd2 Крb8 22. a4 Лhf8 23. a5 Фa6 24. Лb2 C:d4 25. cd Лc8 26. Фd2 Лc7 27. Kh3 Фd3 28. f3 Kh6 29. Ф:d3 C:d3 30. C:h6 gh 31. Ла3 Лc1+ 32. Крf2 Cg6 33. g3 Лfc8 34. Kf4 Cf7 35. Kd3 Л8c2+ 36. Л:c2 Л:c2+ 37. Крe3 b6 38. ab ab 39. Kf4 Лh2 40. Ла1 Крb7 41. Лc1 Ла2 42. Лc3 Лh2 43. Лc1 Ла2 44. Лd1 Ла3+ 45. Лd3 Ла1 46. Лd2 Лh1 47. Лg2 Крc6 48. g4 Л:h4 49. gh Крd7 50. Лg7 Крe8 51. Лh7 b5 52. Л:h6 b4 53. Лh8+ Крd7 54. Лb8 C:h5 55. Л:b4 Cf7 56. Лb7+ Крe8 57. Лb6 Крd7 58. Лd6+ Крe7 59. Л:e6+ C:e6 60. Kg6+, 1:0.

Максім Царук — Ксенія Норман. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. Kd2 c5 4. ed Ф:d5 5. dc C:c5 6. Kgf3 Kf6 7. Cc4 Фh5 8. Фe2 0-0 9. Kf1 Cd6 10. Cg5 Kd5 11. 0-0-0 Cf4+ 12. C:f4 K:f4 13. Фe4 Фh6 14. Фe3 b5 15. C:b5 Cb7 16. Kg3 Лc8 17. Лd4 Фg6 18. Фd2 Kd5 19. Cd3 Фf6 20. Kh5 Фe7 21. Лh4 g6 22. Фh6 f5 23. Лe1 gh 24. C:f5 ef 25. Л:e7 K:e7 26. Фe6+ Крf8 27. Kg5, 1:0.

* * *

У Астане (Казахстан) адзін з турніраў выйграў Аляксей Фёдараў, а ў другім турніры Міхаіл Нікіценка заняў трэцяе месца.

На міжнародных студэнцкіх гульнях ва Уладзівастоку каманда Белдзяржуніверсітэта заняла другое месца, прапусціўшы ўперад толькі кітайскіх шахматыстаў.

Андрэй Кавалёў перамог у традыцыйным турніры па хуткіх шахматах у Віцебску.

На першым дзіцячым Кубку свету ў Батумі (у катэгорыі да 12 гадоў) Дамір Булгак заваяваў бронзавы медаль. Ніка Венская была тут найлепшай у рашэнні шахматных задач.

Дзяніс Лазавік выйграў турнір па бліцы на сайце chess.com (680 удзельнікаў). На рахунку Сяргея Жыгалкі на тым жа сайце 13-е месца з 650, 27-е — з 545, 23-е — з 571 і 26-е — з 680.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца так: 1. Cd5! Правільна адказалі Леанід Шацько, Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

Верны галоўнаму пачуццю

У эфіры тэлеканалаў АНТ і «Расія-Культура» 95-годдзе акцёра Алега Стрыжэнава адзначаць паказам дакументальных і мастацкіх кінастужак. Што дазволіць не толькі згадаць персанажаў увасобленых вялікім артыстам, але і даведацца новыя абставіны яго жыццёвага і творчага шляху.

Акцёр Алег Стрыжэнаў стаў знакаміты пасля выхаду фільмаў «Авадзень», «Хаджэнне за тры моры», «41-ы», «Зорка чароўнага шчасця».

Яго экранныя героі ўскружвалі галовы жанчынам, самому акцёру прысвячалі дзясяткі раманаў з актрысамі. Але ён адзначае: «У маім жыцці быў толькі адзін раман — з маёй прафесіяй». І калі шукаць праўду ў гэтай тэме, то акрамя прафесіі адным сапраўдным было і каханне ў Алега Стрыжэнава. Яго жонка Ліанэла Стрыжэнава, пра якую ён казаў: «Яна ўсё для мяне: яна і сябар цудоўны, і дарадца, і разумніца... Па шчырасці, калі б яе не было побач са мной, я не ўяўляю, я не дажыў бы да сённяшняга дня». У дакументальным фільме «Каханне ўсяго майго жыцця» спадарожніца знакамітага артыста расказала іх гісторыю кахання, калі яны сустракаліся і развітваліся некалькі разоў, але ў выніку ні лёс, ні абставіны, ні нават шлюбы (Ліанэла была замужам за Іванам Пыр'евым, Алег двойчы быў жанаты) не перашкодзілі ім быць разам. Даведацца больш падрабязнасцяў гэтай гісторыі зможаце ў эфіры тэлеканала АНТ 10 жніўня.

На канале «Расія-Культура» ў суботу юбілей легенды кіно, народнага артыста СССР Алега Стрыжэнава адзначаць спецыяльнымі паказамі.

У дакументальнай кінастужцы «Астравы» пра знакамітага артыста згадваюць Сяргей Бязрукаў, Людміла Максакава, Вольга Сошнікава, Вячаслаў Шалевіч...

На міжнародным кінафестывалі ў Канах у 1957 годзе французская прэса назвала Алега Стрыжэнава «рускім Жэрарам Філіпам».

Параўноўваючы савецкага акцёра са сваім кумірам, журналісты мелі на ўвазе не толькі яго знешнасць, але і ўзвышанасць, мужны лірызм і рамантычнасць увасобленых ім персанажаў.

